…. Памёр 13.4.2002 г.

**СМОЛІК Аляксандр Іванавіч**, нарадзіўся 24.10.1944 у в. Каловічы. Беларускі культуролаг і гісторык. Доктар культуралогіі (2000), кандыдат гістарычных навук (1973), прафесар (1999). Закончыў Мінскі педагагічны інстытут (1968) і працаваў у ім з 1968 г. (у 1972–1992 гг. дэкан факультэта). З 1992 г. прарэктар Беларускага універсітэта культуры. Навуковыя працы па гісторыі Беларусі, тэорыі культуры, праблемах развіцця сусветнай і айчыннай культуры і яе ўзаемадзеянняў з сацыяльна-палітычнымі інстытутамі грамадства. Распрацаваў канцэпцыю рэабілітацыйна-

катарсіснага ўздзеяння мастацтва на дэзадаптаваную асобу посткатастрофнага соцыуму, новыя метадалагічныя падыходы ў вывучэнні сацыядынамікі культуры; вызначыў сутнасць, змест і дзейнасць сацыяльных інстытутаў у посткатастрофным грамадстве. Аўтар прац «Гісторыя Беларусі XVI – XIX стст.» (1997), «Культура Беларусі XI – XIX стст.» (1998), «Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме» (1999), «Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме» (1999), «Гісторыя і культура беларускіх татар» (2000, разам з І.Б.Канапацкім).